# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069:780.6(=161.3)]:[069.5+378.4:[008+7](476-25)]

*А. М. Нароўская, І. Г. Лупашка*

## Экспазіцыя музея беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: канцэптуальныя падыходы

*У артыкуле разглядаецца гісторыя стварэння і функцыянавання найбольш вядомых у свеце музычных музеяў. Аналізуецца методыка праектавання экспазіцый. Даецца класіфікацыя музычных інструментаў, якая будзе садзейнічаць іх навуковаму размяшчэнню ў экспазіцыі. Вызначаюцца навейшыя інфармацыйныя тэхналогіі, якія паспрыяюць эфектыўнасці музейнай камунікацыі. Зроблены прапановы па стварэнні экспазіцыі музея беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

Вывучэнне гісторыі стварэння музычных музеяў, методыкі праектавання і стварэння экспазіцый у замежных і айчынных музеях будзе цікавым і карысным для стварэння канцэпцыі экспазіцыі музея народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

У канцы XX – пачатку XXI ст. значны ўклад у тэарэтычнае асэнсаванне праблемы мастацкага праектавання музейных экспазіцый унеслі даследаванні М. Б. Гнядоўскага, М. Е. Каўлен, Т. П. Калугінай, Т. П. Палякова, М. Т. Майстроўскай і інш. [1]. Расійскія культуролагі М. І. Бурлыкіна, С. І. Сотнікава даследуюць пытанні музейных экспазіцый у вышэйшай школе.

Праблемам універсітэтскіх музеяў па пытаннях экспанавання навуковых калекцый і аспектах дзейнасці музеяў як феномена культуры сучаснага замежнага грамадства прысвечаны публікацыі П. Станберы, Д. Уікс, Г. Уілемсана і іншыя, змешчаныя ў міжнародным часопісе «Museum» ЮНЕСКА [7].

У зборніках артыкулаў «На шляху да музея XXI стагоддзя» [4] разгледжаны праблемы мастацкага праектавання экспазіцый у кантэксце канцэпцыі музейнай камунікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікае значэнне для стварэння канцэпцыі музея музыкі мае класіфікацыя музычных інструментаў Хорнбостэля – Закса [6], упершыню надрукаваная ў часопісе «Zeitschrift für Ethnologie» (1914).

Даследчыкі класіфікавалі музычныя інструменты паводле двух асноўных крытэрыяў: *крыніцы гуку* і *спосабу здабывання гуку.* Па першай прыкмеце інструменты падзяляюцца на самагучныя, мембранныя, струнныя і духавыя.

У самагучных інструментах крыніцай гуку з'яўляецца матэрыял, з якога зроблены інструмент або яго частка. У гэтую групу ўваходзіць большасць ударных інструментаў (за выключэннем барабанаў). Па спосабе атрымання гуку самагучныя інструменты падзяляюцца на шчыпковыя, фрыкцыйныя (інструмент вібрыруе з-за трэння з іншым прадметам, напрыклад смычком), ударныя (ксілафон, талеркі, кастаньеты) і духавыя.

У мембранных інструментах крыніцай гуку з'яўляецца туга нацягнутая мембрана (ударныя – барабан, літаўры, шчыпковыя, фрыкцыйныя); у струнных – адна ці некалькі струн (напрыклад, у клавішных інструментах клавесіне, фартэпіяна); у духавых – слуп паветра (флейтавыя, язычковыя – зурна, габой, кларнет, фагот, мундштучныя – труба).

Для стварэння экспазіцыі музея музыкі можна ўзяць за аснову класіфікацыю Э. М. фон Хорнбостэля і К. Закса, якая дазволіць правесці навуковую сістэматызацыю музычных інструментаў і правільна размясціць экспанаты ў вітрынах.

На сённяшні дзень няма абагульняючага культуралагічнага даследавання па праблеме праектавання музейных экспазіцый музычных інструментаў. Пераважная большасць публікацый прысвечана гісторыі развіцця асобных музеяў музыкі.

Даследчыкі вылучаюць некалькі груп музеяў музычнага кірунку: *музычных інструментаў* – Музей Антоніа Вівальдзі (Венецыя, Італія), Музей скрыпкі Антоніа Страдывары (Крэмон, Італія), Нацыянальны музей музыкі і музычных інструментаў (Транхейм, Нарвегія), музей грамафонаў і фанографаў (Санкт-Пецярбург, Расія) і інш.; *мемарыяльныя*, у якіх прадстаўлена спадчына музычных дзеячаў – Дом-музей І. С. Баха (Эйзенах, Германія), Дом-музей Л. Бетховена (Бон, Германія), музей-сядзіба К. М. Агінскага (Залессе, Смаргонскі р-н, Беларусь) і інш.

Да музычных музеяў даследчыкі адносяць так званыя *разнапрофільныя*, у якіх ёсць калекцыі музычных інструментаў: Германскі нацыянальны музей (Нюрнберг, Германія), Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», Музей ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ражытнабеларускай культуры і інш. Кожны з гэтых музеяў не толькі экспануе музычныя інструменты, але праводзіць вялікую культурна-адукацыйную дзейнасць.

Па меркаванні К. М. Наземцавай, музеі адрозніваюцца паводле тыпу музычных інструментаў, віду дзейнасці ў музычным мастацтве (кампазітары, дзеячы тэатраў, музычныя педагогі і інш.), роду дзейнасці (культурны цэнтр, кансерваторыя і інш.) [5, с. 388]. Адзначым, што гэтая класіфікацыя ўмоўная і не зацверджана ў музеялогіі.

Важным аспектам пры стварэнні музея з'яўляецца вывучэнне гісторыі развіцця музеяў музыкі іншых краін. Самаму старажытнаму Музею музычных інструментаў дынастыі Хань у Кітаі, па меркаванні навукоўцаў, больш за 2000 гадоў. У ім прадстаўлены сто пяцьдзясят экспанатаў, якія добра захаваліся: дудачкі з косці, флейты розных памераў і форм, званы з бронзы, акарыны з гліны і літафоны.

Найбольш каштоўныя калекцыі старажытных еўрапейскіх інструментаў захоўваюцца ў музеях Антверпена, Мілана, Фларэнцыі, Базеля, Жэневы, сусветных – у Бруселі, Парыжы (буйнейшая ў Еўропе).

Унікальны музычны музей А. Вівальдзі (Венецыя) размешчаны ў будынку былой царквы Chiesa di San Maurizio. У ім прадстаўлены струнныя музычныя інструменты – віяланчэль Н. Амаці, скрыпкі, альты, мандаліны італьянскіх майстроў пачатку XVII – XIX ст., старажытны клавесін. У асобных залах захоўваюцца фрагменты дэталей струнных інструментаў і майстэрня, дзе іх выраблялі.

У Музеі Страдывары (г. Крэмон) прадстаўлены ўнікальныя экспанаты: скрыпкі Н. Амаці, А. Страдывары, Дж. Гварнеры. Экспазіцыя, размешчаная ў трох залах старажытнага будынка, прысвечана вытворчасці скрыпак (падрабязна апісваецца кожны этап вырабу інструментаў), арыгінальным скрыпкам 2-й паловы XIX – 1-й паловы XX ст., калекцыі асабістых рэчаў А. Страдывары.

Цікавым, на наш погляд, з'яўляецца экспазіцыя Музея старажытнагрэчаскіх, візантыйскіх і поствізантыйскіх музычных інструментаў у Салоніках (Грэцыя), дзе прадстаўлены больш за 200 экспанатаў, у тым ліку рэдкія сямістурнная фармінга мінойскай эпохі, валынкі, якія адлюстроўваюць гісторыю грэчаскай музыкі на працягу 4000 гадоў.

Аналіз дзейнасці музеяў, у якіх прадстаўлены ў экспазіцыі музычныя інструменты, паказаў, што выкарыстоўваюцца розныя метады экспанавання і папулярызацыі музейнай спадчыны краіны. Так, калекцыя гістарычных музычных інструментаў Германскага нацыянальнага музея – адна з буйнейшых у Еўропе. Акрамя выставы, музей пры садзейнічанні Баварскага радыё арганізуе канцэрты з цыкла «Musica

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Antiqua» з удзелам вядомых музыкантаў і выкарыстаннем інструментаў з музейнага збору. Сярод унікальных экспанатаў: трамбон (1551), дэкараваная басовая віёла да гамба (1563) вядомага майстра Г. Фогеля і інш.

Па-іншаму арганізавана экспазіцыя ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры ў Мінску. Там праходзяць урачыстыя канцэрты, наведвальнікі знаёмяцца з жыццём і творчасцю беларускіх кампазітараў Я. А. Глебава (створаны яго мемарыяльны пакой), А. В. Багатырова (заснавальнік кампазітарскай школы), Г. К. Пукста (аўтар першай беларускай дзіцячай оперы «Машанька»). У Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» ў пастаяннай экспазіцыі знаходзіцца адна з самых вялікіх калекцый беларускіх музычных інструментаў (самаробныя гармонікі, лютні-мандаліны, цымбалы і інш.).

Народныя музычныя інструменты экспануюцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры ў Мінску. У Музеі народных музычных інструментаў у г. Шыдловец (Польшча) прадстаўлены больш за 200 музычных інструментаў ад самых простых – свістулькі з саломы да валынкі і скрыпкі, звесткі аб творчасці польскіх народных калектываў, іх аўдыязапісы.

Унікальнай калекцыяй валодае Музей народных інструментаў імя Повіласа Стулгі ў г. Каўнас (Літва). У яго фондах захоўваецца больш за 7000 духавых і струнных інструментаў (дудачкі, грамафоны, упрыгожаныя птушыным пер'ем, фісгармоніі, акардэоны, гуслі-канклесы і інш.) і каля 500 іншых экспанатаў. З дапамогай трансляцыі на дысплэй можна паслухаць, як гучыць той ці іншы інструмент.

Цікавай з'яўляецца экспазіцыя музея казахскіх народных музычных інструментаў у Алматы (Казахстан), у якой прадстаўлены больш за 40 тыпаў інструментаў – ударныя і духавыя, домбры і кабыза, народаў свету. Ёсць у музеі залы археалогіі, мемарыяльных інструментаў (якімі карысталіся вядомыя спевакі-імправізатары), часовых выстаў і прэзентацый, канцэртная на 160 месцаў. Адна выставачная зала музея абсталявана бескантактным сэнсарным гульнявым апаратам, які дазваляе дырыжыраваць аркестрам народных музычных інструментаў, што адлюстравана на маніторы сцяны. Пры музеі створаны фальклорна-этнаграфічны ансамбль для папулярызацыі народнай музычнай культуры.

Унікальным з'яўляецца музей грэчаскіх народных музычных інструментаў у Афінах (Грэцыя), у калекцыі якога больш за 1200 адзінак захоўвання, якія можна праслухаць у запісе. Самы старажытны інструмент датуецца сярэдзінай XVIII ст. На базе музея дзейнічае даследчы цэнтр этнічнай музыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Своеасаблівым архівам еўрапейскіх і сусветных народных інструментаў з'яўляецца музей у Познані (Польшча), у калекцыі якога больш за 2500 экзэмпляраў, у ліку якіх польскія рэдкія інструменты, датаваныя XI ст. На тэрыторыі музея ёсць канцэртная зала, спецыялізаваная бібліятэка і скрыпічная майстэрня.

Такім чынам, для музеяў народных інструментаў характэрна не толькі стварэнне адметных калекцый, але і фальклорна-этнаграфічных ансамбляў, папулярызацыя этнічнай музыкі і народнай музычнай культуры.

Пры стварэнні музеяў народных музычных інструментаў паўстае пытанне, якія з іх варта аднесці да народных, а якія да прафесійных? Напрыклад, скрыпка, валторна, кларнет, цымбалы, труба выкарыстоўваюцца і ў народнай музыцы і ў прафесійным мастацтве.

Па меркаванні Э. Штокмана [9], музычны інструмент набывае якасці народнага, калі ён выконвае пэўную функцыю ў жыццёвых ці абрадавых сувязях народа. Такім чынам, галоўнай прыкметай, якая вызначала прыналежнасць музычнага інструмента да народных, з'яўляюцца сацыяльныя сувязі, што ўстанаўліваюць яго ролю-функцыю ў жыцці народа.

У асобную групу даследавання можна аднесці музеі ўніверсітэтаў, у экспазіцыях якіх прадстаўлены музычныя інструменты. Адным са старэйшых з'яўляецца Музей музычных інструментаў Лейпцыгскага ўніверсітэта (у складзе Музея Грасі), яго калекцыя налічвае звыш 10 тысяч музейных прадметаў, сярод якіх ёсць інструменты XVI–XIX стст. Пастаянная экспазіцыя музея адлюстроўвае гісторыю музыкі і музычных інструментаў, музычнай гісторыі г. Лейпцыга. Спецыяльная экспазіцыя прысвечана творчасці І. С. Баха. У залах музея праходзяць лекцыі для студэнтаў універсітэта і Вышэйшай школы музыкі і тэатра.

У музеі Эшмала Оксфардскага ўніверсітэта (самы старажытны ў Вялікабрытаніі) экспануюцца творы Леанарда да Вінчы, Рафаэля і Мікеланджэла, унікальная скрыпка Страдывары «Месія» (1716) і іншыя скрыпкі і віяланчэлі (21 інструмент), датаваныя XVII–XVIII стст. Падобныя музеі музычных інструментаў створаны ва ўніверсітэтах Францыі, Іспаніі, Італіі, ЗША і інш. Іх калекцыі з'яўляюцца ўнікальнымі, паколькі ўніверсітэты маюць доступ да ведаў і вопыту вучоных, выкладчыкаў і асноўным кантынгентам наведвальнікаў з'яўляюцца студэнты.

Такім чынам, аналіз экспазіцый музеяў музыкі паказаў, што пераважна прымяняецца сістэматычны метад экспанавання, часам тэматычны, вылучаюцца вядучыя экспанаты. Унікальныя экспанаты, такія як скрыпкі Н. Амаці, Дж. Гварнеры, А. Страдывары экспануюцца ў асоб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных вітрынах. Прычым струнныя інструменты прадстаўлены толькі ў вертыкальных вітрынах, што дадаткова падкрэслівае іх пластычную форму. Народныя інструменты ў залежнасці ад памеру дэманструюцца ў вертыкальных і гарызантальных вітрынах. Фонам для струнных інструментаў служыць аксаміт, атлас, для народных – палатно.

Вышэйпрыведзенае даследаванне дало магчымасць прапанаваць стварэнне Музея беларускіх народных музычных інструментаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. За навукова-інфармацыйную аснову прапанаванай канцэпцыі ўзяты матэрыялы аналітычнай запіскі «Калекцыі беларускіх народных музычных інструментаў у музеях Рэспублікі Беларусь: сучасны стан, захаванне і папулярызацыя», улічаны прадметны патэнцыял калекцыі, апошнія дасягненні музейнай навукі і сучасных тэхналогій.

*Мэты экспазіцыі:* далучэнне да гісторыка-культурнай (а менавіта – музычнай) спадчыны Беларусі; прэзентацыя і папулярызацыя нацыянальнага інструментальнага фальклору і традыцыйнага беларускага інструментарыю; набыццё дадатковых ведаў па тэме экспазіцыі; выхаванне агульнамузейнай культуры; прафарыентацыйнае выхаванне; актывізацыя пазнавальнай цікаўнасці наведвальнікаў.

Улічваючы спецыфіку калекцыі і месца размяшчэння экспазіцыі, мэтавай музейнай аўдыторыяй з'яўляюцца студэнты БДУКМ і іншых профільных навучальных устаноў.

*Асноўныя задачы:* пазнаёміць наведвальнікаў з беларускімі народнымі музычнымі інструментамі; раскрыць асаблівасці традыцыйнай беларускай музычнай культуры; далучыць да працэсаў вырабу і рэстаўрацыі музычных інструментаў; адлюстраваць дзейнасць навукова-творчай лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

*Асноўныя ідэі экспазіцыі*

Для раскрыцця адной з галоўных ідэй экспазіцыі ажыццявім навуковы экскурс у гісторыю стварэння музычных інструментаў. Па археалагічных звестках, яны з'явіліся на сумежных з Беларуссю землях яшчэ ў пару палеаліту. Археалагічныя знаходкі музычных інструментаў падрабязна апісаў археолаг Л. Калядзінскі [3]. Так, на паселішчах гэтай пары каля вёсак Мезін Чарнігаўскай вобласці, Гарадок Ровенскай вобласці і Касцёнкі Варонежскай вобласці выяўлены прылады, вырабленыя з косці мамантa, на якіх захаваліся сляды ад рытмічных удараў. На думку некаторых даследчыкаў, іх можна разглядаць як пачатковыя формы музычных інструментаў для ўзнаўлення рытмічных гукаў у час адпраўлення нейкіх магічных дзеянняў, звязаных з паляваннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самыя раннія музычныя інструменты на тэрыторыі Беларусі выяўлены ў паселішчы Дубакрай, (памежжа Віцебскай і Пскоўскай абласцей). Знойдзеныя тут 2 касцяныя флейты ўяўлялі сабою прамыя трубкі з 5 гукавымі адтулінамі. Фрагмент жалейкі (дудкі), зробленай з косткі дробнай птушкі, быў выяўлены і пры раскопках неалітычнага паселішча Асавец у Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці. Датуюцца гэтыя знаходкі IV–III тыс. да н. э.

Прыкладна да гэтай жа пары адносяцца і знаходкі свісцёлак на паселішчы Камень Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Самая вялікая з іх мае даўжыню 11,2 см і дыяметр 4 см. Яна была зроблена з галёначнай косткі бусла.

У бронзавым веку былі ўжо вядомы шматствольныя флейты. Меркаваць пра гэта можна па выніках раскопак некаторых помнікаў так званай лужыцкай культуры, што была распаўсюджана на тэрыторыі Польшчы, а таксама, часткова, на паўднёвым захадзе Беларусі.

Ад ранняга жалезнага веку дайшлі да нас дудкі-свісцёлкі даўжынёю 7,1 см, выяўленыя на гарадзішчы Гарані Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Абодва бакі костак акуратна зрэзаны пад прамым вуглом. Па баках зроблены адтуліны. Падобная да гэтай дудкі рэч знойдзена і ў Слуцку (датавана яна XII–XIII стст.).

У часы Сярэдневякоўя, акрамя вядомых дудак, жалеек і флейт, з'явіліся новыя музычныя прылады. Так, падчас археалагічных раскопак старажытнага г. Друцка (Талачынскі раён Віцебскай вобласці) быў знойдзены рэдкі музычны інструмент – варган. Гэта самагучны язычковы інструмент. Выраблены ён з жалеза, мае падковападобную форму з паралельна падоўжанымі канцамі, паміж якімі праходзіць прымацаваны пасярэдзіне галоўкі язычок – тонкая стальная пласцінка. Памеры яго невялікія: больш за 5 см у даўжыню. У час ігры варган прыціскалі да вуснаў, рот выконваў ролю натуральнага рухомага рэзанатара, язычок зашчыпвалі ўказальным пальцам правай рукі. У выніку бесперапыннай вібрацыі язычка ўзнікаў гук нязменнай вышыні. Даследчык старажытнага Друцка Л. Аляксееў адзначаў, што варган быў знойдзены ў княжацкай частцы горада. Аналагічныя музычныя інструменты захаваліся ў Полацку і ў Лідскім замку.

Пры раскопках старажытнага Ваўкавыска археолагам трапілася шахматная фігурка ў выглядзе вайсковага музыканта-барабаншчыка. Праз плячо ў яго быў падвешаны бочачкападобны барабан. У правай жа руцэ воін трымае вашчагу – драўляную палачку з патаўшчэннем на канцы. Відаць, у XII ст. у Беларусі гэты інструмент быў вядомы, калі майстра, разьбяр па косці, забяспечыў фігурку музыкі такім прадметам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На Верхнім замку Віцебска ў 1978 г. Л. Калядзінскім быў знойдзены мех ад дуды памерам 25x29 см. Верх меха мае 2 скураныя сопл пад ігравыя дудкі, збоку ёсць адтуліна, прашытая па краях: відаць, для «соскі». Доўгі час, на падставе звестак з пісьмовых крыніц, лічылася, што дуда ў Беларусі з'явілася толькі ў XVI ст. Віцебская ж знаходка на трыста гадоў павялічыла гэты «ўзрост».

На Старым замку Гродна ў пласце XIII ст. выяўлены драўляны калок пад струны гусляў. А ў 1993 г. на Верхнім замку Віцебска ў слаі XIV ст. быў знойдзены яшчэ адзін калок ад гусляў даўжынёю 8,2 см. Ён меў выразаную галоўку даўжынёю 2,5 см, памерамі ў сячэнні 2,7x1,5 см са скразной адтулінай, памерамі 1,1x1,5 см, якая плаўна пераходзіла ў стрыжань, круглы ў сячэнні, дыяметрам 1,5–1,6 см. Выраблены калок быў з драўніны ліставой пароды.

Пра высокі ўзровень развіцця музыкі ў Беларусі ў сярэднія вякі сведчыць і той факт, што абраны польскім каралём Ягайла ўзяў з сабой у Кракаў некаторых музыкаў з Беларусі. Напрыканцы XV – пачатку XVI ст. прыдворнай капэлай вялікага князя літоўскага і караля Польшчы кіраваў беларускі спявак і музыкант Чурыла. Вядома, што спяваў Чурыла на беларускай мове пад акампанемент лютні [1].

У якасці сімвалічнай ідэі экспазіцыі прапануем трыяду «Інструмент – Чалавек – Музыка», дзе чалавек – цэнтральнае звяно, без якога не маглі б скласціся астатнія часткі і іх яднанне.

Улічваючы змест калекцыі, бачыцца мэтазгодным вылучыць экспазіцыйныя тэмы згодна з найбольш распаўсюджанай *класіфікацыяй беларускіх народных музычных інструментаў: духавыя; струнныя; мембранныя; самагучныя.*

Дадзеныя экспазіцыйныя тэмы павінны паказаць асартымент, разнастайнасць і асаблівасць кожнай з груп інструментаў. Па магчымасці (у адпаведнасці з прадметным патэнцыялам) будуць адлюстраваны таксама рэгіянальныя асаблівасці таго ці іншага віду інструментаў.

Для вырашэння гэтых задач аптымальным бачыцца выкарыстанне сістэматычнага (калекцыйнага) метаду, які арганізуе экспазіцыю ў адпаведнасці з класіфікацыйнай сістэмай навуковай дысцыпліны.

У межах гэтых экспазіцыйных тэм варта арганізаваць інтэрактыўную прастору, дзе наведвальнікі змогуць непасрэдна кантактаваць з экспанатамі: узяць у рукі для дэталёвага разгляду або з мэтай пайграць на інструменце і г. д.

Для надання экспазіцыі большай вобразнасці прапануем уключыць у яе некалькі экспазіцыйных комплексаў, створаных вобразна-сюжэт-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

ным метадам. Адзін з іх павінен адлюстроўваць беларускую музыку, падкрэсліваючы значнасць музычных інструментаў. Прапануем стварэнне «музейнага нацюрморта» на тэму «Вяселле». Вяселле – важная падзея ў жыцці чалавека, свята, якое ніколі не абыходзілася без музыкаў. У «музейны нацюрморт», на наш погляд, мэтазгодна ўключыць музычныя інструменты з вясельнага ансамбля і этнаграфічныя рэчы, якія сімвалізуюць гэты старадаўні абрад.

Іншыя сямейныя і каляндарна-абрадавыя святы можна прэзентаваць з дапамогай сучасных тэхнічных сродкаў.

Другі «музейны нацюрморт» прапануем прысвяціць Майстру. Гэта будзе своеасаблівая майстэрня, дзе наведвальнік зможа ўявіць працэс вырабу інструментаў. У гэтым жа комплексе мэтазгодна паказаць дзейнасць навукова-творчай лабараторыі па адраджэнні і рэстаўрацыі беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

*Прадметная база экспазіцыі*

Несумненна найбольшай музейнай каштоўнасцю і інфармацыйным патэнцыялам валодаюць музейныя прадметы (МП) – рухомыя аб'екты культурнай і прыроднай спадчыны, першакрыніцы ведаў і эмоцый, узятыя з асяродку бытавання ці музеефікаваныя разам з фрагментамі асяродку.

Сярод МП, прапануемых для ўключэння ў экспазіцыю, вылучым наступныя групы:

– рэчавыя крыніцы (аўтэнтычныя традыцыйныя народныя музычныя інструменты; прадметы побыту пачатку XX ст., якія выкарыстоўваліся ў народнай музычнай практыцы; гарадскія канцэртныя інструменты і інш.);

– фотадакументы (матэрыялы экспедыцый);

– аўтэнтычныя фаназапісы.

Для павышэння інфармацыйнага патэнцыялу і вобразнасці экспазіцыі будуць выкарыстоўвацца навукова-дапаможныя матэрыялы: загатоўкі музычных інструментаў, нанова створаныя інструменты; копіі фотаматэрыялаў, відэазапісы і інш.

Тэхнічныя сродкі, неабходныя для ўзнаўлення адсутных інструментаў, павышэння вобразнасці і атрактыўнасці экспазіцыі.

Інфармацыйны патэнцыял экспазіцыі мяркуецца павысіць з дапамогай «інфакіёскаў», «разумных этыкетак» і да т. п. Наведвальнікі змогуць выкарыстаць вялікую колькасць дадатковай інфармацыі: дакументы, фальклорныя і літаратурныя тэксты па тэме экспазіцыі, тлумачальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэксты, эскізы і схемы, відэа- і аўдыязапісы канцэртаў, вучэбныя, навукова-папулярныя відэафільмы і інш.

*Этыкетаж*

Этыкетаж будучай экспазіцыі павінен уключаць: вядучы тэкст (інфармацыю, якая раскрывае асноўную ідэю, змест і асаблівасці экспазіцыі); анатацыі (тлумачальныя тэксты да экспазіцыйных тэм і комплексаў); цытаты (вытрымкі з фальклорных тэкстаў); уласна этыкетаж (кароткія тэкставыя тлумачэнні да асобнага прадмета, якія змяшчаюць атрыбутыўныя звесткі аб ім).

Этыкетаж у экспазіцыі павінен быць змястоўным, не перанасычаным інфармацыяй, не дубліраваць яе. Па магчымасці (улічваючы эстэтычны і тэхнічны патэнцыял) падаваць яе з дапамогай сучасных інфармацыйных сродкаў: фонакаментарыяў, інфармацыйных навігатараў і інш.

*Тэхнічныя сродкі ў экспазіцыі*

Выкарыстанне тэхнічных сродкаў у экспазіцыі прызначана, перш за ўсё, для павышэння эфектыўнасці музейнай камунікацыі. Магчымы некалькі варыянтаў выкарыстання тэхнічных сродкаў: для каментавання экспазіцыі; для дапаўнення экспазіцыі; у выключных выпадках – для замены МП (галаграма адсутных інструментаў).

Улічваючы спецыфіку экспазіцыі, асаблівая ўвага павінна быць нададзена гукаваму суправаджэнню. Тэхнічныя сродкі не павінны перацягваць увагу ад экспанатаў, а лаканічна ўпісвацца ў экспазіцыю і выконваць дапаможную ролю.

Такім чынам, стварэнне музея беларускіх народных музычных інструментаў у БДУКМ будзе садзейнічаць адукацыйнаму працэсу і выконваць важную ролю ў выкладанні спецыяльных музычных дысцыплін, этнаграфіі і фальклору. Наведванне музея ўніверсітэта акажа добры ўплыў на ўсіх студэнтаў, будзе садзейнічаць лепшаму разуменню ролі музеяў у захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

1. *Гнедовский, М. Б.* Современные тенденции развития музейной коммуникации / М. Б. Гнедовский // Проблемы культурной коммуникации в музейной деятельности : сб. науч. тр. // НИИ культуры. – М., 1989. – С. 16–34.

2. *Калугина, Т. П.* Художественный музей как феномен культуры / Т. П. Калугина. – СПб. : Петрополис, 2001. – 224 с.

3. *Калядзінскі, Л.* Аркестр часоў... палеаліту: як гралі ў Дубакраі? / Л. Калядзінскі // Культура. – 2010. – 10 ліп.

4. На пути к музею XXI века. Региональные проблемы развития музейного дела : сб. ст. – М. : НИИК, 1990. – 157 с. ; На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция : сб. науч. тр. / Рос. ин-т культурологии ; отв. ред. М. Т. Майстровская. – М. : РИК, 1997. – 367 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Наземцева, К. Н.* Музыкальный музей: опыт образовательной и просветительской деятельности / К. Н. Наземцева // Ярослав. пед. вестн. – 2017. – № 6. – С. 388–393.

6. *Поляков, Т. П.* Образно-сюжетный метод в системе взаимосвязей традиционных методов и построения экспозиции / Т. П. Поляков // Проблемы культурной коммуникации в музейной деятельности : сб. науч. тр. // НИИ культуры. – М., 1989. – С. 35–54.

7. *Станбери, П.* Музеи при университетах и их коллекции / П. Станбери. – Museum. – 2000. – № 4 (206). – С. 4–9 ; *Уикс, Джейн.* Одиночество хранителя музея при университете / Джейн Уикс. – Там же. – С. 10–14 ; *Уиллемсон, Г.* Изменить аудиторию университетского музея / Гленн Уиллемсон. – Там же. – С. 15–18.

8. *Хорнбостель, Э. М. фон.* Систематика музыкальных инструментов / Э. М. фон Хорнбостель, К. Закс // Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка. – М. : Сов. композитор, 1987. – Ч. 1. – С. 229–261.

9. *Штокман, Э.* Исследование народных музыкальных инструментов Европы и их описание в многотомном справочнике (Handbuch) / Э. Штокман // Народные музыкальные инструменты : сб. ст. – М., 1987. – Ч. I. – С. 39–55.

*A. Narouskaya, I. Lupashka*

**The exposition of the museum of the Belarusian folk musical instruments of the Belarusian State University of Culture and Arts: conceptual approaches**

*The history of creation and functioning of the most famous music museums in the world is considered in the article. The method of expositions' design is analyzed. A classification of musical instruments that will contribute to their scientific arrangement at the exposition is given. New information technologies that contribute to the effectiveness of museum communication are identified. Proposals on creation of the exposition of the museum of the Belarusian folk musical instruments of the Belarusian State University of Culture and Arts are made.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 30.10.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Да артыкула А. М. Нароўскай, І. Г. Лупашка «Экспазіцыя музея беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: канцэптуальныя падыходы»*



Кантрабас Н. Амаці (Крэмон, 1670) у экспазіцыі Музея музыкі Антоніа Вівальдзі. Фота А. Нароўскай, 2018



Скрыпкі, пач. ХХ ст. у экспазіцыі Музея музыкі А. Вівальдзі. Фота А. Нароўскай, 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Цытра, каля 1600 г. Найбольш старажытны інструмент у экспазіцыі
Музея музыкі А. Вівальдзі. Фота А. Нароўскай, 2018



Чэшскі музей музыкі, г. Прага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Фрагмент экспазіцыі Музея музыкі А. Вівальдзі.
Фота А. Нароўскай, 2018



Майстэрня вырабу музычных інструментаў.
Музей музыкі А. Вівальдзі. Фота А. Нароўскай, 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Вітрыны з дэталямі музычных інструментаў. Музей музыкі А. Вівальдзі.
Фота А. Нароўскай, 2018



Музей грэчаскіх народных інструментаў. Афіны, Грэцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Музей грэчаскіх народных інструментаў. Афіны, Грэцыя



Музей музычных інструментаў. Берлін, Германія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ